ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Бюро
Прэзідыума Нацыянальнай
акадэміі навук Беларусі
23.12.2021 № 591

# ПАЛАЖЭННЕ
аб памятным знаку
“У гонар 100-годдзя
Інстытута беларускай
культуры”

1. Памятны знак “У гонар 100-годдзя Інстытута беларускай культуры” (далей – памятны знак) заснаваны Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі да 100-годдзя першай у гісторыі Беларусі комплекснай навукова-даследчай дзяржаўнай установы – Інстытута беларускай культуры (1922 – 1928 гады), якая ў 1928 годзе была рэарганізавана ў Беларускую акадэмію навук (з 1997 года – Нацыянальная акадэмія навук Беларусі).

Памятны знак з’яўляецца формай заахвочвання за дасягненні ў навуковых даследаваннях і распрацоўках, уклад ва ўмацаванне навукова-тэхнічнага патэнцыялу краіны, станаўленне і развіццё акадэмічнай навукі Рэспублікі Беларусь, пашырэнне міжнародных навуковых сувязей і ўмацаванне міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі.

2. Памятны знак уручаецца:

вучоным і работнікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і іншых навуковых арганізацый Рэспублікі Беларусь, кіраўнікам і работнікам іншых арганізацый Рэспублікі Беларусь, якія ўнеслі асабісты ўклад у развіццё навукі, за плённую дзейнасць па ўмацаванні навукова-тэхнічнага патэнцыялу краіны, павышэнні эфектыўнасці навуковых даследаванняў, інавацыйнай дзейнасці, адукацыі, за ўкараненне вынікаў навуковых даследаванняў у практычную дзейнасць і (або) вучэбны працэс;

замежным грамадзянам, якія аказалі значны ўплыў на пашырэнне і паглыбленне міжнародных навуковых сувязей і ўмацаванне міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва;

маладым вучоным, якія плённа ўдзельнічаюць у навуковых даследаваннях і дасягнулі высокіх вынікаў у навуковай дзейнасці.

3. Рашэнне аб уручэнні памятнага знака прымаецца пастановай Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

4. Хадайніцтвы аб уручэнні памятнага знака ўносяцца:

работнікам арганізацый Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – аддзяленнямі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па прадстаўленні замацаваных за імі арганізацый Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

работнікам арганізацый Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, не замацаваных за аддзяленнямі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, – намеснікам Старшыні Прэзідыума, які курыруе гэтыя арганізацыі, па прадстаўленні арганізацый Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

асобам, якія працуюць у арганізацыях іншай ведамаснай падпарадкаванасці, – па прапановах гэтых арганізацый у аддзяленні Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па прыналежнасці да галіны навукі;

кіраўнікам і работнікам структурных падраздзяленняў апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – кіраўніком апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па ўзгадненні з членамі Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якія курыруюць гэтыя падраздзяленні.

5. Прадстаўленне да ўручэння памятнага знака афармляецца на беларускай мове ў адпаведнасці з устаноўленай формай (дадаецца) і падаецца за 15 дзён да меркаванага дня ўручэння. Да прадстаўлення прыкладаецца даведка-аб’ектыўка і ксеракопія 31 старонкі пашпарта, на якой пазначана прозвішча грамадзяніна на рускай і беларускай мовах.

6. Праект пастановы Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аб уручэнні памятнага знака рыхтуе структурнае падраздзяленне апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якое адказвае за прадстаўленне да ўзнагароджання (заахвочвання) дзяржаўнымі і ведамаснымі ўзнагародамі (заахвочваннямі).

7. Работнікам апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якім уручаны памятны знак, выплачваецца грашовае ўзнагароджанне ў памеры трох базавых ставак (памер базавай стаўкі вызначаецца на дату прыняцця пастановы Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аб уручэнні памятнага знака) за кошт бюджэтных асігнаванняў, прадугледжаных на аплату працы па каштарысе апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Работнікам арганізацый Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якім уручаны памятны знак, выплачваецца грашовае ўзнагароджанне ў памеры трох базавых ставак (памер базавай стаўкі вызначаецца на дату прыняцця пастановы Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аб уручэнні памятнага знака) за кошт сродкаў арганізацый, у якіх яны працуюць.

Пытанні матэрыяльнага заахвочвання іншых асоб вырашаюцца па месцы іх асноўнай працы.

По рашэнні Бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі грашовае ўзнагароджанне можа быць дапоўнена (заменена) каштоўным падарункам або выплата грашовага ўзнагароджання можа ажыццяўляцца са сродкаў цэнтралізаванага фонду Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

8. Асобам, якім уручаны памятны знак, выдаецца пасведчанне. Пасведчанне афармляецца на беларускай мове і падпісваецца Старшынёй Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі або асобай, якая выконвае яго абавязкі.

9. Паўторна памятны знак не ўручаецца. Дублікаты памятнага знака і пасведчання да яго ўзамен згубленых не выдаюцца.

10. Запіс аб уручэнні памятнага знака ўносіцца ў працоўную кніжку работніка. Персанальны ўлік асоб, якім уручаны памятны знак, ажыццяўляецца Галоўным упраўленнем кадраў і кадравай палітыкі апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Дадатак
да Палажэння аб памятным
знаку “У гонар 100-годдзя
Інстытута беларускай
культуры”

Форма

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**
**да ўручэння памятнага знака**
**“У гонар 100-годдзя Інстытута беларускай культуры”**

**1. Прозвішча, імя, імя па бацьку (у адпаведнасці з пашпартам)**
______________________________________________________________

**2. Пасада, месца працы, службы (назва арганізацыі адпаведна зарэгістраванаму статуту)** ________________________________________

**3. Вучоная ступень, вучонае званне** ______________________________

**4. Асаблівыя заслугі, за якія прадстаўляецца да ўзнагароды (кароткая фармуліроўка):** за распрацоўку і ўкараненне ў вытворчасць высокаэфектыўных тэхналогій стварэння новых кампазіцыйных матэрыялаў, плённую навуковую і навукова-арганізацыйную дзейнасць

**5. Інфармацыя аб асабістых дасягненнях** ___________________________

Кіраўнік арганізацыі ______________________________________
(подпіс, ініцыялы, прозвішча)

“___”_____________ 20___ г.